**«ГРО́ДНА»**, гасцініца. Пабудавана ў 1985 у г. Гродна (архіт. Ю.Патапаў, В.Папоў, У.Еўдакімаў, Ю.Раманаў) з цэглы ў грамадскім цэнтры па вул. Паповіча ў комплексе з рэстаранам і кінатэатрам «Кастрычнік». Шаснаццаціпавярховы будынак вуглавой сіметрычнай кампазіцыі з вылучэннем уваходнай групы. У маст. абліччы выкарыстаны прыёмы канструктывізму. Архіт.-прасторавая кампазіцыя заснавана на групоўцы аб'ёмаў розных вышынь, якія прыступкавай формай узвышаюцца да цэнтра. Дамінуючы аб'ём падкрэсліваецца 2-павярховай прыбудовай уваходнага памяшкання-хола, які выступае за межы прасторавай кампазіцыі пабудовы. Звонку будынак аздоблены керамічнай пліткай, у інтэр'ерах — абліцоўка гранітам і мармурам. У цэнтр. частцы размешчаны лесвічныя пралёты, ліфтавыя шахты, у бакавых крылах — жылыя нумары (на 500 месцаў). *Ю.Ю.Захарына.*



*Гасцініца* ***«Гродна»*** *ў г. Гродна.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ